Дзмітрый Аляксандравіч Жук

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Дзмітрый Аляксандравіч Жук (нар. 7 ліпеня 1970, Леткаўшчына, Мінская вобласць, Беларусь) — беларускі журналіст, з 2018 года галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия», прапагандыст рэжыму Лукашэнкі.

Сын беларускага пісьменніка Алеся Жука[1].

Дзмітрый Аляксандравіч Жук	
Асабістыя звесткі	
Дата нараджэння	7 ліпеня 1970 (52 гады)
Месца нараджэння	Леткаўшчына, Маяцкі сельсавет, Слуцкі раён, Мінская вобласць, БССР, СССР
Грамадзянства	Беларусь
Бацька	Алесь Жук
Альма-матар	філалагічны факультэт БДУ (1992)
Месца працы	СБ. Беларусь сегодня Беларускае тэлеграфнае агенцтва
Прафесійная дзейнасць	
Род дзейнасці	журналіст, прапагандыст
Узнагароды	Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Выдатнік друку Беларусі[d] Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (25 ліпеня 2018)

Біяграфія

У 1992 годзе скончыў філалагічны факультэт БДУ па спецыяльнасці — выкладчык беларускай і рускай моў і літаратуры. У 1992—1993 гадах працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў школе-гімназіі ў Мінску. З 1993 па 1997 гады працаваў у выдавецка-інфармацыйным цэнтры Нацыянальнага банка Беларусі. У 1997—1999 гадах працаваў у прадстаўніцтве расійскага інфармацыйнага агенцтва «Интерфакс» у Беларусі. У лістападзе 1999 года прызначаны кіраўніком прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. З 2003 па 2018 гады займаў пасаду дырэктара РУП «Беларускае тэлеграфнае агенцтва».

З 6 лютага 2018 года прызначаны галоўным рэдактарам газеты «Советская Белоруссия»[2].

Міжнародныя санкцыі

У 2011 годзе разам з іншымі ўплывовымі супрацоўнікамі і кіраўнікамі дзяржаўных СМІ Беларусі быў уключаны ў Чорны спіс Еўрасаюза ў сувязі з хваляй рэпрэсій пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года. Дзмітрыю Жуку быў забаронены ўезд на тэрыторыю краін ЕС, а актывы падлягалі замарожванню[3]. Паводле Еўрапейскага савета Дзмітрый Жук: *«нясе адказнасць за перадачу медыямі дзяржаўнай прапаганды, якая падтрымлівала і апраўдвала рэпрэсіі супраць дэмакратычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці 19 снежня 2010 г., выкарыстоўваючы сфальсыфіцыраваную інфармацыю»*[4]. У 2016 годзе забарона была знята[5].

20 лістапада 2020 года ўнесены ў санкцыйныя спісы Літвы, Латвіі і Эстоніі[6].

Узнагароды

- Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;
- медаль «За працоўныя заслугі»;
- Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;
- нагрудны знак «Выдатнік друку Беларусі»,

- Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2018)[7].

Зноскі

1. Пять фактов о новом главном редакторе «Советской Белоруссии» Дмитрии Жуке (руск.) (https://udf.by/news/main_news/169028-pyat-faktov-o-novom-glavnom-redaktore-sovetskoy-belorussii-dmitrii-zhuke.html)
2. Лукашенко обновил руководство центральных СМИ // БЕЛТА (руск.) (http://www.belta.by/president/view/lukashenko-obnovil-rukovodstvo-tsentralnyh-smi-288140-2018/)
3. Поўны спіс 208 беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у ЕС (https://nn.by/?c=ar&i=61552)
4. Council Decision 2012/642/CFSP of 15 October 2012 concerning restrictive measures against Belarus = Рашэнне Еўрапейскага савета аб рэстрыктыўных мерах супраць Беларусі, 15 кастрычніка 2012 г. (англ.) (http://eur-lex.europa.eu/eli/dec/2012/642/oj)
5. ЕС зняў санкцыі з Беларусі (https://krynica.info/be/2016/02/15/es-znyau-sankcyi-z-belarusi/) Архівавана (https://web.archive.org/web/20210905110458/https://krynica.info/be/2016/02/15/es-znyau-sankcyi-z-belarusi/) 5 верасня 2021.
6. Литва, Латвия и Эстония расширили санкционные списки беларусских чиновников (https://reform.by/181443-litva-latvija-i-jestonija-rasshiril-sankcionnye-spiski-belarusskih-chinovnikov) (руск.). *reform.by* (20 лістапада 2020). Праверана 5 верасня 2021.
7. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2018 года № 565 «Аб узнагароджанні Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь» (https://pravo.by/upload/docs/op/C21800565_1532638800.pdf) (недаступная спасылка)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Дзмітрый_Аляксандравіч_Жук&oldid=4417599"